КУЛЬТУРА НАЦЫЯ

www.sakavik.net

# Сельская гаспадарка

**Сельскагаспадарчыя ўгоддзі ў Беларусі займаюць - 43%. На 1 студзеня 2014 года, плошча сельскагаспадарчых угоддзяў складала 8.726 тысяч гектараў або 87,260 кв.км. або поле даўжынёй і шырынёй прыблізна 400 на 220 км.**

**Па плошчы ворнай зямлі на чалавека, 5637 кв.м., Беларусь займае 3-е месца ў Еўропе (Літва – 7213, Украіна – 7110), і 8-е месца ў свеце (2011 год, www.helgilibrary.com).**

**Па плошчы лясоў на чалавека Беларусь займае 6-е месца ў Еўропе, 9094 квм (Фінляндыя – 41312, Швецыя – 30073, Нарвегія – 20586, Эстонія – 16543, Латвія – 14980) (2010 год, www.helgilibrary.com).**

**Па вытворчасці бульбы на чалавека Беларусь займае 1-е месца ў свеце, 185 кг (Туркменістан – 140 кг, Філіпіны – 115 кг) і 9-е месца ў Еўропе па агульнай вытворчасці бульбы, 1.754 ктон (2011 год, www.helgilibrary.com).**

**Па вытворчасці жыта Беларусь займае 3-е месца ў Еўропе і 4-е месца у свеце, 1082 ктон (Германія – 3893 кт, Польшча – 2888 кт, Расія – 2132 кт) (2012 год, www.helgilibrary.com).**

**Па вытворчасці льнонасення Беларусь займае 5-е месца ў Еўропе, 8664 тон (Брытанія – 42000 т, Украіна – 41000 т, Швецыя – 23700 т, Францыя – 23742 т) (2012 год, www.helgilibrary.com).**

**16% сусветных пасеваў ільну знаходзіцца ў Беларусі. Беларускі лён – гэта 300 тысячаў гектараў пасеваў, што раўняецца полю ў 3000 кв.км. (30кмх100 км), для параўнання - плошча Люксембурга складае 2586 кв.км. Кожная дзясятая тона льновалакна і 16% рынку льняных тканінаў у свеце – гэта беларускі лён. Экспартуецца ў ЗША, Германію, Аўстрыю, Турцыю, Чэхію, Кітай.**





